ентацыяй на зах. мастацтва, з аднаго боку, і імкненнем да фалькл. традыцый — з другога. Твораў магілёўскага фрэскавага жывапісу захавалася няшмат: многія фрэскі загінулі ў 1930—70-я гг. (*Магілёўскі Іосіфаўскі сабор*, Богаяўленскі сабор, Васкрасенская царква), інш. схаваны пад вапнавымі напластаваннямі (*Магілёўская Пакроўская царква*). *Д.А.Краўчанка.*

**МАГІ́ЛЬНА** (у 1979—91 в. Нёман), вёска ва Уздзенскім р-не, на левым беразе р. Нёман. За 16 км на ПдЗ ад г. Узда, 12 км ад чыг. ст. Коласава на лініі Мінск—Брэст, 90 км ад Мінска. Цэнтр Нёманскага с/с (да 1.8.1979 Магільнянскі с/с). 177 гаспаларак, 373 ж. (2013).

У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 1235. У 13 ст., паводле некаторых летапісаў, каля М. адбылася Магільнянская бітва войск ВКЛ з татарамі (многія гісторыкі лічаць гэтыя звесткі легендай). Уладанне вял. кн. літоўскага Вітаўта, потым кн. Кобрынскіх. У 1480 мястэчка ў Віленскім ваяв., з 1507 у Навагрудскім павеце ВКЛ, належала Пацам, Радзівілам і інш. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у Рас. імперыі, у Ігуменскім павеце Мінскай губ. У 1886 — цэнтр воласці, 84 двары, 700 ж., царква, капліца, сінагога, школа, 4 крамы. З 1.1.1919 у БССР. З 20.8.1924 г. цэнтр Магільнянскага с/с Уздзенскага р-на, да 26.7.1930 у Мінскай акрузе. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да 4.7.1944 М. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў 1943 часткова спалілі вёску. У М. дзейнічала падп. антыфаш. група (кіраўнік Г.В.Суслава). З 25.12.1962 у Дзяржынскім, з 30.7.1966 зноў ва Уздзенскім р-нах. З 1.8.1979 цэнтр Нёманскага с/с. У 1959 — 453 ж., у 1970 — 494 ж., у 1999 — 218 гаспадарак, 515 ж.

У 2013 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, амбулаторыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і ААТ «ААБ Беларусбанк», 2 магазіны; Мікалаеўская царква (1990-я гг.). Помнік сав. воінам і землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Каля вёскі рэшткі замка 16—17 ст.

**МАГІЛЬНЯ́НСКАЯ СЯДЗІ́БА.** Існавала ў 19 ст. ў в. Магільна Уздзенскага р-на. Складалася з панскага двара, куды вяла брама з абарончай залай у верхнім ярусе, і гасп. комплексу. Цэнтр падвор'я займаў вял. прамавугольны ў плане драўляны сядзібны дом на падклеццях, накрыты драніцай. Падклецці былі прыстасаваны пад гасп. памяшканні. У асн. паверсе будынка, куды вяла вонкавая лесвіца, месціліся прыхожая, сталовая, святліца, спальня і 3 каморы. Пакоі абаграваліся грубкамі, абліцаванымі паліванай кафляй, сцены сталовай былі дэкарыраваны чорным сукном. Непадалёку ад дома знаходзіўся флігель. Панскі двор з гасп. злучала 2-ярусная брама, у верхнім ярусе якой мелася 3-камернае жылое памяшканне. Гасп. комплекс уключаў кухню, 2 хаты чэлядзі, сыраварню, хлявы, адрыну, вазоўню, свіран, крыты ток. Сядзіба не захавалася.

**МАГІЛЬНЯ́НСКІ ЗА́МАК.** Існаваў у пач. 15 — 17 ст. на правым беразе р. Нёман, насупраць в. Магільна Уздзенскага р-на. У пісьмовых крыніцах упершыню згадваецца ў 1446. Абараняў пераправу цераз раку і шлях на Капыль і Клецк. Чатырохвугольная ў плане пляцоўка замка (65 × 110 м) была выцягнута ўздоўж р. Нёман, абкружана валам і аддзелена глыбокім (да 8 м) ровам. Захаваліся 2 дугападобныя валы (выш. 1—1,5 м), з паўн. боку — роў (глыбіня 1,5 м), з паўд. боку — выступ паўкруглай формы (магчыма, рэшткі вежы). Меў уязную браму з пад'ёмным мостам і не менш 4 вуглавых вежаў. М.з. быў забяспечаны рознай агнястрэльнай зброяй. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67 замак быў разбураны. Пазней у гіст. крыніцах не згадваецца. У 1975 замчышча амаль цалкам знішчана дарожнабуд. работамі. Археал. даследаванні М.з. праводзілі А.Мітрафанаў (1951), Г.Штыхаў (1975), Л.Калядзінскі (1977—79), М.Чарняўскі (1979), В.Шаблюк (1986—87). Падчас раскопак выяўлены быт. інвентар, керамічныя вырабы 16—17 ст. (напр., кафля 1-й пал. 16 ст. з выявай анёла). *Л.У.Калядзінскі.*

**МА́ГІЯ** (лац. magia), сістэма мыслення, пры якой чалавек звяртаецца да патаемных сіл з мэтай паўплываць на пэўныя з'явы, а таксама рэальна ці ўяўна ўздзейнічаць на стан матэрыі; рытуальныя дзеянні і слоўныя формулы, з дапамогай якіх людзі імкнуцца ўздзейнічаць на прыроду, інш. людзей і жывёл. Адна з форм першабытных вераванняў, калі важнае значэнне мелі групавыя дзеянні, звязаныя ў першую чаргу з абрадамі пераходу (роды, ініцыяцыі, вяселле, пахаванне) і палявання. Паводле механізму ўздзеяння існуюць абрады М. кантактнай, ініцыяльнай, імітатыўнай, парцыяльнай, апатрапейнай, катартычнай. Кантактная М. заснавана на перакананні, што магічная сіла можа быць перададзена непасрэдным кантактам з прадметам ці істотай чалавеку (нашэнне амулетаў, ужыванне замоўленага зелля, абрад спальвання вопраткі хворага чалавека). Ініцыяльная М. пачынаецца з пажаданага дзеяння, закончыць якое павінна нейкая таямнічая сіла. Пры гэтым, каб дасягнуць неабходнага выніку, дзеянне суправаджаецца пэўным слоўным пажаданнем. Імітатыўная М. заснавана на ўяўленні пра падабенства прадметаў, з'яў, істот. Напр., каб пчолы не адляталі ў інш. мясцовасць, пчаляры клалі на дно вулля вянок з галінак, рыбакам услед кідалі палкі, каб яны злавілі такую ж вял. рыбу. Каб нанесці шкоду чалавеку, падчас абраду яго выяву пратыкалі вострым прадметам. Парцыяльная М. грунтуецца на веры ў тое, што асабістыя рэчы захоўваюць сувязь са сваім гаспадаром на адлегласці. З гэтай прычыны ў вядзьмарстве часта выкарыстоўваецца кроў, пазногці, зубы,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

валасы таго чалавека, на якога накіравана ўздзеянне. Апатрапейная М. засцерагае ад варожых сіл з дапамогай замоў, агню, кругоў і інш. Катартычная М. накіравана на ачышчэнне цела чалавека або яго жытла ад негатыўнага ўздзеяння розных сіл пры дапамозе рытуальнага *абкурвання*, абмывання, ужывання ці ўстрымання ад пэўных прадуктаў і інш. Існуюць таксама і змяшаныя тыпы М., калі ў абрадах спалучаюцца некалькі спосабаў уздзеяння. Напр., у абрадзе «пакрыванне поля» спалучаюцца элементы М. імітатыўнай і ініцыяльнай (дзяўчына падкідвала ўгору першы нажаты сноп і прыгаворвала: «Пакрыла ніўку на добрую спажыўку, парадзі, Божа, збожжа»). Асобна вылучаюць М. аграрную, накіраваную на атрыманне добрага ўраджаю, і вербальную. Вербальная М. распаўсюджана ў бел. фальклоры ў выглядзе замоў, пажадання дабра, праклёнаў, вітанняў і інш., якія мелі сакральны сэнс. У наш час многія магічныя дзеянні выконваюцца несвядома, на ўсялякі выпадак (нашэнне амулетаў або інш. прадметаў, якія нібыта прыносяць удачу, ужыванне магічных сродкаў вылячэння ў спалучэнні з нар. медыцынай, вера ў сурокі, прарочыя сны, варажбу па руцэ або на картах і інш.).

*Літ.*: Барташэвіч Г.А. Магічнае слова. Мінск, 1990. *А.М.Аляхновіч.*

**«МАГУ́ТНЫ БО́ЖА»**, міжнародны фестываль хрысціянскай духоўнай музыкі. Праводзіцца з 1993 у г. Магілёў раз у 2 гады па ініцыятыве пробашча касцёла Св. Станіслава ксяндза Магілёўскай рымска-каталіцкай парафіі У.Бліна. Арганізатары — Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, магілёўскія абл. і гар. выканаўчыя к-ты пры садзейнічанні Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Рэспубліцы Беларусь і Экзарха ўсяе Беларусі, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага. Назва ад духоўнага гімна М.Равенскага «Магутны Божа» на вершы Н.Арсенневай, які стаў муз. эмблемай фестывалю. Асн. мэты — адраджэнне духоўнай музыкі, актывізацыя творчых працэсаў і культ. жыцця горада, узаемаабагачэнне культур, яднанне хрысціян розных канфесій. У рамках фестывалю праводзіцца конкурс харавых калектываў і вакалістаў (выкананне твораў духоўнага зместу і ўдзельнікаў), канцэрты прафес. калектываў і лаўрэатаў фестывалю, арганнай музыкі, творчыя сустрэчы, а таксама фота- і кніжныя выстаўкі, прэзентацыі. У дні форуму ў храмах каталіцкай і праваслаўнай канфесій праходзяць святочныя набажэнствы, адбываецца хрэсны ход ад кафедральнага сабора Трох Свяціцеляў да дома св. Георгія Каніскага. Прадстаўнікі пратэстанцкай царквы ладзяць падчас фестывалю выступленні маладзёжных калектываў; на пешаходных вуліцах на працягу 3 дзён праходзяць канцэрты царк. перазвонаў. У 1993—2013 у фестывалі прынялі ўдзел больш за 12 тыс. выканаўцаў: калектывы, салісты з Беларусі, а таксама Расіі, Балгарыі, Мексікі, Іспаніі, Ірландыі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Малдовы, Германіі, Венесуэлы, Сербіі, Італіі, ЗША і інш. У 2013 дыпламантамі сталі народны хор муз. каледжа (г. Мазыр) і жаночы хор каледжа муз.-пед. ін-та (Масква).

*Л.А.Густова.*

**МАДА́ЛЬНЫЯ СЛО́ВЫ**, лексіка-граматычны клас слоў, з дапамогай якіх выражаюцца суб'ектыўныя адносіны гаворачага да зместу выказвання. Могуць выражаць: лагічную ацэнку выказвання, рэальнасць паведамлення («сапраўды», «безумоўна», «несумненна», «канешне», «відавочна» і інш.), магчымасць, верагоднасць, дапушчэнне, сумненне ў даставернасці паведамлення («магчыма», «напэўна», «відаць», «здаецца» і інш.). М.с. пазбаўлены намінатыўнай функцыі, яны не з'яўляюцца членамі сказа і граматычна не звязаны са словамі, якія ўтвараюць сказ. Асн. сінтаксічныя функцыі: выкарыстанне ў ролі слова-сказа, часцей у дыялагічным маўленні (« — Вы будзеце стаяць у чарзе? — Напэўна»); ужыванне ў якасці пабочнага слова з мадальным значэннем («У вас да гэтага, канешне, няма ніякага інтарэсу»). Да М.с. не адносяцца: пабочныя словы, якія выражаюць эмацыянальныя адносіны да фактаў рэчаіснасці («на шчасце», «на жаль», «на здзіўленне» і інш.); лексічныя адзінкі са значэннем удакладнення, тлумачэння, абмежавання («у прыватнасці», «дарэчы» і інш.), словы, якія ўказваюць на сувязь думак, парадак іх выкладу, спосаб афармлення і з'яўляюцца блізкімі да злучнікаў («папершае», «нарэшце», «наадварот», «аднак», «значыць», «словам», «так бы мовіць» і інш.). Корпус М.с. папаўняецца за кошт функцыянальна-семантычнага пераасэнсавання і абасаблення пэўных дзеяслоўных форм («здаецца», «відаць», «можа быць»), склонавых форм назоўнікаў («словам», «па ўсёй верагоднасці», «на шчасце»), займеннікавых слоў («само сабой», «ніяк») і інш. Упершыню ва ўсх.-слав. мовазнаўстве вылучыў і апісаў М.с. як самаст. катэгорыю В.У.Вінаградаў. У сучаснай лінгвістыцы М.с. застаюцца прадметам для дыскусій з пункту гледжання іх аб'ёму і граматычнага статусу.

*Д.В.Дзятко.*

**МАДЖА́РСКІЯ** (сапр. Маджаранцы), Мажарскія, Мадзьярскія, армянскія майстры-ткачы 18 — пач. 19 ст.; бацька і сын. Арандатары Слуцкай мануфактуры шаўковых паясоў.

Ян (Аванес; 1-я пал. 18 ст., Стамбул — каля 1800), кіраўнік *Нясвіжскай мануфактуры шаўковых паясоў*, мастак-картаньер, ткач. Ткацкаму рамяству вучыўся ў Стамбуле. У 1740-я гг. вырабляў паясы ў г. Станіслаў (цяпер г. Івана-Франкоўск, Украіна). У 1758 запрошаны М.К.Радзівілам Рыбанькам у Нясвіж. Каля 1767 пераехаў у Слуцк, наладзіў мануфактуру, на якой у тым жа годзе выпусціў больш за 200 паясоў. Унёс у распрацоўку паясоў маст. традыцыі Блізкага Усходу, матывы зах.-еўрап. стыляў і разам з тым выкарыстоўваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ